***Я. А. Гарадніцкі,*** *канд. філал. навук, дац.,*
*дац. каф. беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры*

# РОЛЯ СУБ'ЕКТА ТВОРЧАСЦІ Ў КУЛЬТУРНЫХ ПРАЦЭСАХ ЭПОХІ ПОСТМАДЭРНА

Постмадэрнізм у мастацтве сёння ўспрымаецца ўжо ў многім як гістарычны факт; сучаснае мастацтва, літаратура набываюць новыя эстэтычныя і светапоглядныя якасці і прыкметы. Разам з гэтым адыходзіць паступова ў мінулае і сама эпоха постмадэрна, якая была на сутыку стагоддзяў (і тысячагоддзяў) даволі яскравай і прыкметнай з'явай. Якую назву атрымае мастацтва нашага часу, што ствараецца на нашых вачах, – гэтае пытанне застаецца адкрытым.

Справа, вядома, не ў назве, а ў тых асноватворных, базісных прынцыпах, на якіх будуецца канцэпцыя культуры, ствараецца мадэль узаемаадносін мастацтва і рэчаіснасці. У сучасным мастацтве, мастацтве XXI ст., зноў узмацняюцца пазіцыі рэалізму; творчы метад аналітычнага пранікнення ў жыццё з дапамогай сродкаў мастацкага выяўлення паказвае сваю актуальнасць і нязменную прадуктыўнасць.

Асабліва наглядна тэндэнцыі сучаснага мастацкага развіцця выяўляюцца пры тыпалагічным супастаўленні аднародных з'яў у розных відах мастацтва. У прыватнасці, уяўляецца плённым суаднясенне тэндэнцый развіцця сучаснага выяўленчага мастацтва і літаратуры. На літаратуру сёння аказвае значны ўплыў *візуалізацыя* культурнага асяроддзя. Спалучэнне сродкаў вербальнага і візуальнага выражэння дае ў літаратуры даволі цікавыя вынікі.

Беларуская літаратура, засвойваючы вопыт нацыянальнага і сусветнага выяўленчага мастацтва, імкнецца пашырыць арсенал сродкаў вобразнага ўвасаблення. У той жа час і на выяўленчае мастацтва Беларусі пэўнае ўздзеянне аказвае вопыт літаратурнага развіцця. Перспектыўным у плане раскрыцця механізмаў узаемадзеяння гэтых двух відаў мастацтва – выяўленчага і слоўнага – можа быць аналіз асаблівасцей праяўлення ў іх праблемы фігуратыўнасці.

Па сведчанні мастацтвазнаўцаў [3], фігуратыўнасць у сучасным выяўленчым мастацтве вяртае страчаныя ў мінулым пазіцыі, яна зноў становіцца папулярнай і запатрабаванай у творчасці сучасных мастакоў. У пэўнай ступені на такі паварот паўплывалі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэалістычныя традыцыі фігуратыўнай, прадметнай вобразнасці мастацкай літаратуры.

Для літаратурнай творчасці таксама характэрна выкарыстанне ўмоўных, абстрагаваных вобразаў, стварэнне ірэальных выяў. Перш за ўсё гэта датычыцца мадэрнісцкай літаратуры. У беларускай, традыцыйна рэалістычнай, літаратуры такія мадэрнісцкія праявы таксама мелі месца, хоць і з пэўнай зрушанасцю па часе адносна тэндэнцый сусветнага мастацкага развіцця. Можна згадаць, напрыклад, *квантэмы* і іншыя жанравыя паэтычныя формы, распрацаваныя ў другой палове XX ст. Алесем Разанавым.

Характэрнай асаблівасцю развіцця літаратуры ў XX ст. з’яўляецца тое, што ў ёй рэалістычны напрамак часта прадстае ў цесным узаемадзеянні з іншымі мастацкімі сістэмамі і стылямі. Гэта ж адметнасць характэрна і для беларускай літаратуры, якая пры ўсёй сваёй бытавой заземленасці, прадметна-рэчыўнай пэўнасці адчувала на працягу гістарычнага развіцця ўплыў як з боку фальклорна-міфалагічнай паэтыкі, так і з боку мадэрнісцкіх напрамкаў і плыней.

Вызначальнай прыкметай стылявой своеасаблівасці беларускай літаратуры з’яўляецца *сінтэтызм*, паяднанасць разнародных мастацкіх напрамкаў у цэласным адзінстве, іх трансфармацыя і засваенне ў адпаведнасці з характарам нацыянальнай мастацкай традыцыі. Гэта дамінантная лінія гістарычнага развіцця беларускай літаратуры. Разам з тым варта адзначыць, што дадзены сінтэтызм паўстае ў сучасных умовах у сваім абноўленым выглядзе, на яго аказваюць несумненны ўплыў рэаліі культурнай прасторы сучаснасці, у тым ліку і вопыт развіцця сумежных відаў мастацтва.

Мастацтвазнаўцы Т. Кандраценка і М. Баразна падкрэсліваюць, што задоўга да выяўлення характэрнай для сучаснага жывапісу тэндэнцыі сумяшчэння «рэалістычнай прасторы і сюррэалістычных сімвалаў» беларускія мастакі некалькіх пакаленняў (Г. Вашчанка, У. Стальмашонак, М. Селяшчук, Г. Скрыпнічэнка, У. Тоўсцік, В. Альшэўскі і інш.) шырока распрацоўвалі тэхніку мантажу, «сумяшчалі ў адной плоскасці розначасавыя сюжэты і нават выкарыстоўвалі прыём калажу» [3, с. 125]. Падобныя ў нечым прыёмы структурнай арганізацыі твора выкарыстоўвалі і беларускія пісьменнікі. Так, напрыклад, даволі часта ў мастацкія тэксты ўключаюцца фрагменты дзённікаў, дакументаў, перапіскі.

Празаічны тэкст можа змяшчаць у сабе вершаваныя часткі. У рамане У. Караткевіча «Нельга забыць» значнае месца займаюць

уключаныя ў агульную структуру твора паэмы, якія складаюць некалькі асобных раздзелаў (XII, XVI). Такія іншародавыя і іншажанравыя ўкрапленні маюць не толькі кампазіцыйнае, але і сюжэтнае, канцэптуальнае значэнне, па-свойму удзельнічаюць у раскрыцці галоўнай ідэі твора.

Навацыямі ў структурна-кампазіцыйнай, сюжэтнай сферах вызначаецца проза М. Стральцова, таксама як і У. Караткевіч, празаіка і паэта. Яскравым прыкладам з'яўляецца яго апавяданне «Смаленне вепрука», якое ўяўляе сабой тэкст у тэксце. Наратыўную аснову гэтага апавядання складае расказ пра тое... ***як бы*** аўтар ***напісаў*** вынашанае ім ва ўяўленні, у думках і ўспамінах апавяданне. У аповесць «Адзін лапаць, адзін чунь» М. Стральцоў уключае вершаваныя тэксты, якія надаюць твору дадатковы, іншасказальны сэнс, уводзяць у аповяд лірычны падтэкст.

У творчасці прадстаўнікоў маладзейшых пакаленняў беларускіх пісьменнікаў, празаікаў, паэтаў, драматургаў, даволі выразна выявіліся пэўныя рысы постмадэрнісцкай паэтыкі. Варта згадаць перш за ўсё такія імёны, як А. Глобус, А. Бахарэвіч, А. Брава, З. Вішнёў, В. Жыбуль, А. Спрынчан, В. Трэнас... Дарэчы, у творчасці некаторых з іх выразна прасочваецца тэндэнцыя да ўзаемадзеяння са сферай іншых мастацтваў, у першую чаргу з выяўленчым. Так, З. Вішнёў стварае творы, у якіх графічная выява спалучаецца з вербальным тэкстам. Прыкметы візуальнай паэзіі (фігуратыўны верш, паліндром) характэрны для творчасці А. Спрынчан і В. Жыбуля.

Гульня з тэкстамі і іх значэннямі, праявы інтэртэкстуальнасці і іроніі – прыкметы постмадэрнісцкай паэтыкі, якія пэўным чынам адбіліся на стылявой характэрнасці твораў сучасных беларускіх пісьменнікаў. Разам з тым неабходна адзначыць, што вельмі выразна акрэсленых здабыткаў у плане выражэння паэтыкі постмадэрнізму ў беларускай літаратуры апошняга часу не так і шмат.

Чым гэта тлумачыцца? Недахопам яскравых творчых індывідуальнасцей або тым жа сінтэтычным характарам беларускай літаратуры? Мабыць, на падобныя пытанні нельга адказаць адназначна, тым больш калі справа датычыцца постмадэрнісцкай плыні ў літаратуры і мастацтве, з'явы ўвогуле плыннай, якая з цяжкасцю паддаецца строгім дэфініцыям.

Ва ўсякім выпадку даводзіцца канстатаваць, што праблема аўтара, якая востра ставілася на парадак дня тэарэтыкамі пост-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

структуралізму, у беларускай літаратурнай сітуацыі мае сваю спецыфіку. Гульня з тэкстамі не засланіла ў нашай літаратуры суб'екта творчасці, якім з'яўляецца аўтар твора.

Каб паказаць спецыфіку праяўлення аўтарскага пачатку ў беларускай літаратуры, патрэбна звярнуцца да вытокаў, да пачатку станаўлення новай беларускай літаратуры на мяжы XIX–XX стст. У гэты час плённа ўзаемадзейнічалі традыцыі калектыўнай, ананімнай літаратурнай і фальклорнай творчасці з тэндэнцыямі да раскрыцця аўтарскай творчай індывідуальнасці. Падобны сінтэтызм найбольш выразна выявіўся ў стылявых адносінах у сказавай апавядальнай манеры.

У стылі маладой беларускай літаратуры выяўлялася блізкасць творчай манеры аўтараў да народнай апавядальнай традыцыі, знаходзіла ўвасабленне карціна свету, у якой рэальныя прыкметы сумяшчаліся з гратэскавымі вобразамі. У выражэнні ў наратыве сказавай манеры і экспрэсіўнай мастацкай дамінанты, стварэнні вобразаў, заснаваных на міфалагічных уяўленнях, прыкметна пераемнасць паміж новай беларускай літаратурай пачатковага перыяду яе фарміравання і літаратурай XX ст., якой таксама ўласцівыя традыцыйныя формы мастацкага ўвасаблення, звязаныя з архаічным светаўспрыманнем.

Можна заўважыць, напрыклад, пэўную сувязь паміж паэтыкай і вобразнасцю ананімнага гумарыстычнага верша «Уваскрэсенне Хрыстова», які датуецца прыблізна канцом XVIII – пачаткам XIX ст., і такім творам, як аповесць У. Караткевіча «Ладдзя Роспачы». Мы маем на ўвазе ў першую чаргу стылявую блізкасць у выяўленні гратэскавага вобраза Смерці. У ананімным творы невядомым аўтарам гэты алегарычны вобраз малюецца экспрэсіўнымі фарбамі, у травестыйным духу: «Смерць ляжала ў куточку / I грызла сваю сарочку» [1, с. 8]. Такая ж экспрэсіўнасць мастацкага выражэння характэрна і для адпаведнага вобраза, створанага У. Караткевічам, творчай манеры якога наогул былі ўласцівыя павышаная экспрэсіўнасць, насычанасць фарбаў і адценняў, выразнасць форм, сакавітасць мовы: «Смерць узяла шклянку і, прысёрбваючы, села на каменную лаву. Пчолы шкодзілі ёй, і таму яна адламала галінку барбарысу з бутонам і пачала абмахвацца ёю...» [2, с. 138].

Сказавая апавядальная манера праяўляецца перш за ўсё ў тых творах, дзе прыкметнай стылеўтвараючай кампанентай з'яўляецца іронія аўтара/апавядальніка, а разам з тым выяўляецца стыхія народнай смехавой культуры. У гэтым напрамку стылявога

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

развіцця беларускай літаратуры якраз даволі цесна пераплятаюцца і ўзаемадзейнічаюць індывідуальна-аўтарскае і традыцыйна-жанравае, асаблівасці аўтарскай творчай манеры накладваюцца на канву агульналітаратурнага развіцця.

Пры даследаванні праблемы суаднесенасці ў літаратурным працэсе суб'ектыўнага і аб'ектыўнага павінны ўлічвацца шматлікія фактары, якімі ён вызначаецца. У першую чаргу неабходна падыходзіць да вырашэння гэтай праблемы з гістарычнага пункта гледжання. У кожную культурна-гістарычную, літаратурна-мастацкую эпоху было сваё разуменне суб'ектыўнасці і аб'ектыўнасці, характару іх увасаблення і ўзаемадзеяння ў літаратурным творы. У беларускай літаратуры на працягу мінулага стагоддзя адбываўся прыкметны рух у глыбіні чалавечай суб'ектыўнасці, якая раскрывалася як праз аўтарскае светабачанне, так і праз псіхалагічныя моманты выяўлення персанажных характараў.

У той жа час бралася ў разлік традыцыйная ўласцівасць народнага светаўспрымання, якая заключалася ў засяроджанасці на рэаліях навакольнага свету, уважлівых адносінах да прадметнай увасобленасці рэчаіснасці, паколькі падобная адметнасць светабачання характарызавала асноўнага рэцыпіента нацыянальнай літаратуры, які быў цесна звязаны з прыродным асяроддзем. Такая сканцэнтраванасць на канкрэтна-пачуццёвай сферы быцця, якой у многім вызначалася адметнасць нацыянальнага светаўспрымання, абумоўлівала таксама і паэтыку літаратуры, яе стылявую характэрнасць.

Аўтарскі, суб'ектыўны пачатак своеасабліва праяўляецца ў беларускай літаратуры ў сферы жанравага абнаўлення. Даследчыкі ўжо звыкла карыстаюцца такім тэрміналагічным азначэннем, як *аўтарскія жанры*. Значны ўклад у распрацоўку аўтарскіх жанраў у паэзіі зрабіў А. Разанаў, увёўшы ў мастацкую практыку такія адметныя жанравыя вершаваныя формы, як *квантэмы, версэты, зномы* і інш.

Аўтарскай распрацоўкай жанра сучаснай балады плённа займаецца В. Шніп. Балады В. Шніпа, прысвечаныя выдатным людзям Беларусі, вызначаюцца сваёй жанравай своеасаблівасцю. Гэта творы перш за ўсё лірычныя, у іх выражаецца галоўным чынам аўтарскае бачанне той або іншай асобы, яе ролі ў нацыянальнай гісторыі. Нельга, аднак, сказаць, што тут пануюць чыста

суб’ектыўнае ўспрыманне і суцэльная лірычная эмоцыя, хоць, з другога боку, гэта і не аб’ектывізаваныя накіды партрэтаў.

В. Шніп распрацаваў арыгінальную аўтарскую баладную форму, у якой галоўны акцэнт прыпадае на раскрыццё духоўнай сувязі паміж суб’ектам і аб’ектам паэтычнага твора. Балады В. Шніпа сінтэтычныя па сваёй жанравай прыродзе. Яны напоўнены шматлікімі рэаліямі, дэталямі, падрабязнасцямі, якія паўнаважка прадстаўляюць кантэкст гістарычнай эпохі. І ў той жа час гэта, па сутнасці, своеасаблівыя паэтычныя маналогі, дзе дамінуе голас аўтара, паэтычныя пасланні, з якімі аўтар звяртаецца да сваіх герояў-адрасатаў. Асаблівая набліжанасць, духоўная паяднанасць аўтара з героямі выражаецца тут і праз граматычную форму займенніка другой асобы. Тым самым дасягаецца своеасаблівы эфект двухбаковага выяўлення героя – знутры і звонку, праз спалучанасць асабовага і таго, што ўласціва «іншаму».

Менавіта такі падыход дае В. Шніпу магчымасць выявіць вобразы герояў балад не ў іх забранзавеласці і манументальнасці, а як вобразы жывых людзей у пэўныя моманты іх зямнога існавання. Краявід і духоўная прастора становяцца пры гэтым быццам агульнымі для аўтара і героя, прасякнутымі адзінай настраёвасцю, як гэта добра выявілася ў «Баладзе Генадзя Цітовіча»:

Сцежка дадому цябе сагравае,
Быццам бы песня, што маці спявае
Ціха і ўзнёсла, як моляцца Богу.
Светла ўплятаецца сцежка ў дарогу,
Дзе, нібы золата, промні саломы,
Нібы ў нябёсы, умерзлыя ў снег [4, с. 44].

Цікавыя спробы робяцца беларускімі паэтамі па суб’ектывізацыі такога шматпланавага жанру, як паэма. У № 7 часопіса «Полымя» за 2011 г. змешчаны ліра-эпічны цыкл А. Бадака «Камяні». Наогул гэты цыкл можна назваць з поўнай на тое падставай паэмай, паколькі ўсе яго часткі сюжэтна звязаны між сабой і ўтвараюць пэўнае ідэйна-мастацкае адзінства. Гэта яшчэ адно сведчанне таго, што межы ў сучасным паэтычным дыскурсе паміж жанрам паэмы і іншымі формамі кампазіцыйнага спалучэння вершаваных твораў даволі рухомыя. Сучасная паэма вызначаецца якраз сцісласцю, лапідарнасцю, сэнсавай шматзначнасцю. У «Камянях» А. Бадака рэальная жыццёвая сітуацыя, якая праламляецца скрозь аўтарскую свядомасць, набывае рысы філасофскай прытчы пра сувязь чалавека з зямлёй.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У творы А. Бадака шмат біблейных і агульнакультурных алюзій і рэмінісцэнцый, архетыпаў і сімвалаў. З рэальнага-побытавага плану дзеянне пераключаецца ў метафізічную прастору, дзе асаблівае значэнне набываюць такія паняцці, як радзіма, род, далёкае, блізкае і г.д. Заканчваецца твор тым, што аўтарам прызнаецца непазбежнасць суіснавання чалавека ў двух прастора-часавых вымярэннях – рэальна ўспрымаемым і метафізічна ўяўляемым. Спадарожнікі, якія едуць у цягніку ў адным кірунку, заняты кожны думкамі аб сваім, у кожнага з іх свая жыццёвая мэта, таксама як і розныя іх вытокі, «адпраўныя пункты». І ўсё ж жыццё зблíжае людзей, дае адчуванне агульнай накіраванасці і мэтазгоднасці.

Думаецца, што выяўленая ў творы А. Бадака мадэль міжасабовых адносін можа быць дапасавана і да праблемы суб'ектыўнасці ў творчым працэсе.


1. *Беларуская* літаратура XIX стагоддзя : хрэстаматыя / склад. А. А. Лойка, В. П. Рагойша. – 2-е выд. – Мінск : Выш. шк., 1988. – 487 с.

2. *Караткевіч, У.* Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Мастац. літ., 1988. – Т. 2 : Аповесці, апавяданні, казкі – 511 с.

3. *Кондратенко, Т. Г.* Особенности развития новой белорусской и немецкой фигуративной живописи / Т. Г. Кондратенко, М. Г. Борозна // Весн. Віцеб. дзярж. ун-та. – 2009. – № 2. – С. 122–127.

4. *Маладосць.* – 2011. – № 2.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ